Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №4 (43), 2007

*УДК 811.161.3-08-085-3*

# Параўнанне як сродак стварэння вобразнасці ў паэзіі Якуба Коласа

Л. В. Паплаўная

Параўнанне выступае важным сродкам стварэння вобразнасці ў паэзіі Якуба Коласа.

Прырода стварэння параўнання цікавіла чалавека яшчэ з антычных часоў. Так, Марк Тулій Цыцэрон пісаў аб тым, што параўнанню паддаецца рашуча ўсё: “Няма на свеце такога прадмета, назву, імя якога мы не маглі б ужыць у пераносным сэнсе. Таму што ўсё, што паддаецца параўнанню, – а параўнанню паддаецца рашуча ўсё, можа быць сціснута пераносным выразам па падабенству ў адзінае слова, а яно ўпрыгожвае мову яркім выразам” [1, с.234].

Параўнанні вызначаюцца даследчыкамі то як тропы, то як фігуры, таму існуюць розныя іх класіфікацыі. Адны даследчыкі не бачаць у параўнанні змянення значэння слова, другія разглядаюць яго як семантычную адзінку, утвораную за кошт семантычнага пашырэння сэнсу слова. Прааналізаваная навуковая літаратура дае падставу сцвярджаць, што параўнанне – прасцейшы від тропа, у якім ярка выражана наяўнасць аб’екта і суб’екта параўнання. Такой думкі прытрымліваюцца Дз.Э.Разенталь, М.Я.Цікоцкі, В.І.Іўчанкаў. “У параўнанні найбольш ярка і поўна абазначана сутнасць пераносу значэння, у ім яўна прысутнічаюць усе элементы тропа”, – падкрэслівае В.І.Іўчанкаў [2, с.76].

Сутнасць параўнання заключаецца у супастаўленні аднаго прадмета, з’явы, дзеяння з другім па інтэгральных прыметах з мэтай тлумачэння сутнасці аднаго праз характэрныя прыметы, уласцівасці другога, што абумоўлена пэўным падабенствам.

Словы, якія параўноўваюцца, “нясуць імпліцытную сэнсавую нагрузку, з’яўляюцца нібы ланцужком паміж пунктам погляду аўтара і аб’ектам” [3, с.31].

Мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца выяўленне тыпаў параўнанняў і іх стылістычнай ролі ў паэтычнай мове класіка беларускай літаратуры.

У паэзіі Я.Коласа параўнанне – адзін з самых ужывальных тропаў. У вершаваных творах паэта прадстаўлены самыя розныя спосабы выражэння параўнанняў і ўвядзення іх у кантэкст. Найбольш пашыраны злучнікавыя параўнанні, якія граматычна афармляюцца пры дапамозе злучнікаў **як**, **нібы**, **бы**, **быццам**. Злучнікі выконваюць не толькі ролю фармальнага паказчыка тропа, але і выражаюць пэўныя сэнсава-граматычныя адносіны паміж суб’ектам і аб’ектам параўнання.

Так, параўнанні са злучнікам **як**, якіх найбольшая колькасць у паэзіі Я.Коласа, выражаюць супастаўленне суб’екта і аб’екта параўнання на аснове сцвярджальнага характару іх падабенства: Вецер свішча так, **як звер** (1, 93); Жар да сэрца падступае, **Як чорная хмара** (1, 70); Срэбрам адлівае, **Як люстэрка**, Нёман (1, 39); І кроплі імжакі блішчаць, **Як слёзы на вецці** (2, 17); Мы край баранілі, **як пчолы свой вырай** (2, 277); А твар яго, **як сонца**, ясны (6, 91); І месяца бліскучы крайчык Па небе пстрыкаў, **як той зайчык** (6, 68); Агонь блішчыць, **як воўча вока** (6, 52); Па небе хмары, **як палотны**, Паўночны вецер расцілае (6, 152); А там за возерам, **як струнка**, Пралегла роўненька чыгунка (6, 239).

Параўнанні са злучнікамі **нібы**, **бы**, **быццам** выразна не выяўляюць катэгарычнасць падабенства. Яно выражаецца з адценнем меркавання, няпэўнасці: На ветравеях, **нібы воўна**, Плывуць хмурынкі так чароўна (2, 159); Па-над рэчкай дуб вячысты Не схісне ніводным лістам, Стаў, **нібы ўладар** (2, 161); **Нібы шоўк залаты**, Вецер полымя кідаў на хаты (2, 197); Неба зорная паляна, **Нібы ў кветках луг** (2, 217); Усё маўчыць, **бы сон закляты Навялі тут ведзьмары** (2, 9); Дзе неба, **бы тая хрустальная чаша**, спадае бераг зямлі (2, 287); Многа павяла, **бы кветак**, дачок (2, 397); А чыгунок, **бы пан пузаты,** Кіпіць, пыхціць, шуміць заўзята (6, 59); Што без слядочка, **быццам цені**, У смутным нікнуць задуменні (6, 51); І дрыгнуў поезд, **быццам чэрці Яго сярдзіта скаланулі** (6, 241).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Як падкрэслівае А.А.Някрасава, “злучнікавы тып граматычна аформленых параўнанняў мае свае мастацка-экспрэсіўныя патэнцыі, якія аддзяляюць іх не толькі ад параўнанняў, выражаных творным склонам назоўніка, але і ад параўнанняў злучнікавага тыпу з іншым аператарам, паколькі паэтычныя тэксты асабліва тонка рэагуюць на змяненне характару мадальнасці выказвання” [4, с.7].

Наступную ў колькасных адносінах групу складаюць параўнанні ў форме творнага склону назоўнікаў. Творны параўнання – гэта бяззлучнікавае дзеяслоўнае параўнанне, сродкам выражэння якога з’яўляецца назоўнік у форме творнага склону (аб’ект параўнання) з пераносным значэннем, які адначасова абазначае якасць дзеяння суб’екта параўнання і яго метафарычную характарыстыку. Напрыклад: **Воўчым вокам** акно У цемры ночы блішчыць (1, 138); Злегла **воўнаю густою** Цемра ночы над зямлёю (2, 140); Ляснічы **воўкам** пазірае (6, 187); Глядзяць **сіратою** лугі (2, 173); За вагонам вагон Мчыцца **змеем ліхім** (1, 92); Зялёны луг, як скінуць вокам, **Абрусам пышным і шырокім** Абапал Нёмна рассцілаўся (6, 9); За імі дзядзька наш з накропам З вярбы на землю шуснуў **снопам** (6, 104); А над уласнай гаспадаркай **Варонай чорнаю закаркай** І цяжкі крыж пастаў над ёю (6, 73).

Значна менш сустракаецца ў паэзіі Якуба Коласа параўнанняў у форме параўнальнай ступені прыметніка ці прыслоўя: А побач жанчына, **гваздзічкі мілей** (2, 418); У вобразах яркіх, **ярчэй ад лазуры**, Жыве Руставелі (2, 122); Іх воля **цвярдзей ад граніту** (2, 74); І сам дарэктар клышаногі **Не горш ад вучняў** бег з дарогі (6, 136); Засвецяць ў інеі праменні, **Як найдарожшыя каменні** (6, 162); Бацькаў хлеб **смачней віна** (6, 374); Обер-аб’ездчыкам лічыўся, **Брахун не горшы ад сабакі** (6, 98); Калі зямлю вярнуў Хадыка **Не горш вала таго ці быка** (6, 230).

Сярод параўнанняў, зафіксаваных у паэтычнай мове Якуба Коласа, значную групу складаюць фразеалагізмы-параўнанні. Напрыклад: І вось, вярнуўшыся з абходу, **Як бы апушчаны ў воду**, Міхал павёў апавяданне (6, 75); І ў нейкім страсе і ў захопу На дзядзьку-кухара глядзелі, **Як бы яны аслупянелі** (6, 60); І зноў жа службу леснікову Ён ведаў, **як свае пяць пальцаў** (6, 31); Села там і не лажыцца, **Як прышыта да акна!** (6, 447); Доўга спаў ён, **як забіты** (6, 385); Так і жыў ён, гадаваўся, **Бы пры сцежцы той гарох** (6, 290); А ён малы, **як ліст асіны**, дрыжыць ад страху, жмецца, плача (6, 272); Сказаў Антось, і ўсе ўздыхнулі, **Як бы гару з плячэй сапхнулі** (6, 60); Снуе народ, **як на пажары**, Пад ім аж гнуцца тратуары (6, 249).

Значна радзей сустракаюцца ў паэзіі Я.Коласа параўнанні, выражаныя параўнальнымі даданымі сказамі. Даданыя параўнальныя сказы з’яўляюцца прэдыкатыўнай адзінкай, што змяшчае ў сабе пэўнае паведамленне, якое шляхам параўнання паясняе і ўдакладняе тое, пра што гаворыцца ў галоўнай частцы. Напрыклад: Усе варушыліся, снавалі, **Як бы мурашнік раскапалі** – Такая тут была трывога (6, 43); Яны гараць, жывуць і граюць, **Бы вочкі там чыесь міргаюць** (6, 177); Струны сэрца ў ім дрыжалі, **Як дрыжыць бліскание зор У надземнай цёмнай далі** (6, 294); **Быццам грымнуў гром у глухім камлі** – Дуб у Свіслач зваліўся, знямелы (2, 215); Шырай, шырай зараніца Разнімае крылле, **Нібы пожар б’е крыніцай** Там, на небасхіле (1, 82).

Зафіксаваны адзіны выпадак выражэння параўнання ў паэзіі Я.Коласа назоўнікам з прыназоўнікам: І надта родзіцца капуста: **З вядро** галоўкі вырастаюць (6, 26).

У паэтычнай мове Якуба Коласа найбольш пашыраны простыя параўнанні, пабудаваныя на збліжэнні дзвюх з’яў або прадметаў па адной якой-небудзь агульнай прыкмеце. Напрыклад: Чыстыя росы, **як срэбра**, блішчалі (1, 66); **Як і ночка**, думкі чорны (6, 404); Ідуць па воду маладзіцы, **Як макаў цвет**, гараць іх ліцы (6, 163); А вочы шэры, невялічкі, Глядзяць прыветна, **як сунічкі** (6, 137); Выплыў месяц круглы, поўны, Падрумянены, **як блін** (1, 158). Такія параўнанні складаюцца з аднаго слова ці маюць залежныя словы, якія паясняюць, дапаўняюць аб’ект параўнання.

Сустракаюцца і разгорнутыя параўнанні, якія ўказваюць на некалькі падобных рыс у супастаўляемых прадметах. “У разгорнутае параўнанне ўключаюцца два паралельныя вобразы, у якіх аўтар знаходзіць многа агульнага” [5, с.142]. Дзякуючы такому параўнанню раскрываецца шэраг якасцей з’явы ці прадмета: Задуменне ляжыць у блісканні, **Як той усмех апошні**

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**расстання**, **Як той погляд кахання супольны** (6, 399); І, **як козачка лясная, Бы той лёгкі матылёк**, Ганна вішні расхінае (6, 348); Як прыгожа-павабны вы, зоры! **Нібы высыпаў іней агністы**, **Нібы пацерак шнур прамяністы Асвятляе глыбіні-прасторы** (6, 347).

Асобным відам параўнання ў паэзіі Я.Коласа з’яўляецца адмоўнае параўнанне, у якім пры знешнім супрацьпастаўленні двух паняццяў ці з’яў маецца глыбокае ўнутранае іх супастаўленне. Напрыклад: **То не дуб у бары Заскрыпеў, застагнаў – Гэта я без пары Богу душу аддаў** (1, 81). Такія параўнанні бяруць свой пачатак з вуснай народнай творчасці.

Для большага ўздзеяння на чытача, перадачы эмоцый, пачуццяў паэт карыстаецца прыёмам ампліфікацыі параўнанняў. Напрыклад: Патрэбен ён [цар – Л.П.], братцы, **Як прус у аладцы**, **Як у мосце дзірка**, **Як з гразі зацірка**, **Як скула балячцы** (1, 112). Смех паненак маладых, Разубраных, **як у маі Кветкі тыя на лугах**, **Як вясной бярозкі ў гаі**, **Як валошкі на палях** (6, 432).

Розныя паводле структуры параўнанні ў паэзіі Якуба Коласа маюць разнастайную семантыку. Найбольш пашыраны ў мове паэта параўнальныя канструкцыі, лексічнымі напаўняльнікамі якіх выступаюць:

***а) назвы жывёл і птушак***: Глядзіць, бы **воўк** той, заўжды скрыва (6, 78); Ляжу, ці сяжу я, ці проста шнурую, як **воўк** у смугу (2, 436); З людзьмі грызешся, як **сабака** (6, 83); Ідзе ціха, ані гуку, Бы **кот**, крадзецца цішком (6, 381); Як **парасяты**, У пяску капаліся сястрычкі (6, 14); Самы жывуць там, як **цяляты**! (6, 26); Рэха, бы той лёгкі **конь**, Па-над возерам пабегла (6, 427); Паны разбегліся, як **мышы** (2, 36); Як **саранча**, паўзуць пачвары На нашы гоні, рубяжы (2, 183); Крычыць, махае кулакамі, А вочы тыя, як у **змея** (6, 84); І не было б табе граху: Забіў**,** як **вош** або **блыху**! (6, 86); Так і ўскіпіць, як **рак** чырвоны – Такі ён кручаны, шалёны! (6, 192); Плечы ўскіне, засмяецца, Як **матыль** над лямпай, ўецца, Як над краскай чмель, гудзе (6, 433); Разгорне люд, нібы **арол** той крылы (2, 286); Я ж адзін, і я ў журбе, Як той **грак** на дубе (2, 357); Паплыву, як **лебедзь**! (6, 334); І на хмаркі кіне вока, Што, як **гусанькі**, плылі (6, 291); А я насуплюся, як **сыч** (2, 444); Уперавалку, як бы **качка**, У хату йдзе кума-сваячка (6, 109); А над уласнай гаспадаркай **Варонай** чорнаю закаркай (6, 73);

***б) назвы дрэў і раслін***: Жанчыны, як **вішні**, мужчыны – **дубы** (2, 69); Песні, як **мак**, расцвілі (2, 96); Застыдзілася яна, Як **цвет маку**, ўся дазвання Шчочка стала чырвана (6, 344); Гнуўся люд твой, нібы **лозы** (2, 150); Прываблівы, мудры, і скромны, І стойкі, як **дуб** (2, 239); **Белай кветкаю-купалкай** Будзеш гушкацца ў вадзе (6, 450); Смех паненак маладых, Разубраных, як у маі **Кветкі** тыя на лугах, Як вясной **бярозкі** ў гаі, Як **валошкі** на палях (6, 432); Гудуць драпежна, тнуць балюча, Бы **крапіва** тая пякуча (6, 16); І бліскаюць яе вочкі, Як у жыце **васількі** (6, 386);

***в) назвы прыродных з’яў***: І голас пранёсся, як **бура** (2, 114); Прамільгнулі гады, як **маланка** (2, 327); Спадзі наніз, як **пярун** з хмары (6, 430); Яна заззяла, бы **зарніца**, У цьме вячэрняю парою (6, 429); Як і **ночка**, думкі чорны (6, 404); Зоры высыплюць, бы **іней** (6, 302); Жаль да сэрца падступае, Як чорная **хмара** (1, 70); Антось, як **сонца,** засвяціўся (6, 90); Свецяць вочы іх, як **зоры**, Радасцю гараць (2, 127); Тут сыр, як першы **снег**, бялюткі (6, 112);

***г) назвы канкрэтных прадметаў***: Увесь, як **рэшата**, дзіравы (6, 91); Погляд дзікі так і коле, Так і рэжа, як **нажом** (6, 458); Снег, бы **посцілка**, ляжыць (6, 445); Перад імі, як **талерка**, Ціха кругліцца, блішчыць, Ззяе возера-люстэрка (2, 401); Стаяў хлявец якраз напроці І чуць ліпеў, як бы на плоце **Гаршчок**, разбіты качаргой (6, 12); Дзяцей, як тых **снапкоў** на току! (6, 22); У бліскучым лісцейку, як **свечкі** На алтары ў часы малення, Іскрацца сонейка праменні (6, 209).

Нярэдка ў вершаваных радках Якуб Колас спалучае параўнанне з іншымі тропамі, такімі як метафара і эпітэт. Адзін троп дапаўняе другі, што спрыяе стварэнню цэласнага сэнсава-зрокавага малюнка, як у вершы “Ноч перад навальніцай”:

Бы косяць неба-сенажаць.
Бурліць крыніца агнявая,
Бы нейкі грозны віхар-вір,
І бляскі-іскры разлівае,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Як залаты агністы жвір (1, 210).

Па-майстэрску ўведзеныя ў кантэкст параўнанні, метафары і эпітэты ствараюць яркі і запамінальны вобраз перадвавальнічнай ночы.

Праведзены аналіз параўнанняў у паэзіі Якуба Коласа, дазваляе зрабіць вывад, што параўнанне – гэта моўны сродак, з дапамогай якога аўтар дасягае трапнай характарыстыкі прадметаў і з'яў рэчаіснасці, стварае яркія і запамінальныя вобразы. Параўнанне з'яўляецца неад'емным элементам структуры яго паэтычных твораў, арганічна спалучаецца з іншымі вобразнымі сродкамі, такімі як метафара і эпітэт, што дазваляе аўтару стварыць аб'ёмную мастацкую сімволіку, значна ўзмацніць канкрэтныя вобразы і вобразную сістэму ў цэлым.

**Abstract.** The paper studies similes in the language of the poetic works by Yakub Kolas. It considers the main types of similes and their stylistic role.

### Літаратура

1 Цицерон. Три трактата об ораторском искусстве. [Текст]: научн. изд. / Цицерон. – М.: Наука, 1972. – 471с.

2 Ивченков, В.И. Лингвостилистика тропов Юрия Казакова / В.И. Ивченков. – Мн.: УП «Ред. научн.-метод. журн. «Пачатковая школа», 2002. – 112 с.

3 Вовк, В.Н. Языковая метафора в художественной речи. Природа вторичной номинации. [Текст]: научн. изд. / В.Н. Вовк. – Киев: Навукова думка, 1986. – 140 с.

4 Некрасова, Е.А. Сравнения в стихотворных текстах (Блок, Пастернак, Есенин) // Е.А. Некрасова, М.А. Бакунина. Языковые процессы в современной русской поэзии. – М.: Наука, 1982. – 312с.

5 Голуб, И.Б. Стилистика современного русского языка. [Текст]: учебн. пос. / И.Б. Голуб. – М.: Высш. шк., 1988. – 320 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 30.03.07

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ